В. І. Свірыдзенка

Беларуская мова

Вучэбны дапаможнік для 2 класа
агульнаадукацыйных установ
з рускай мовай навучання

У дзвюх частках

Частка 2

Дапушчана
Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь

МІНСК
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2010

УДК 811.161.3(075.2=161.1)
ББК 81.2Рус-922
С24

Р э ц э н з е н т ы:

аддзел беларуска-рускіх моўных і літаратурных сувязей дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (доктар філалагічных навук, прафесар, дырэктар інстытута *А. А. Лукашанец*);

метадыст вышэйшай катэгорыі аддзела адукацыі Горацкага раённага выканаўчага камітэта Магілёўскай вобласці *Т. М. Жарыкава*;

настаўнік пачатковых класаў вышэйшай катэгорыі ўстановы адукацыі «Аршанская дзяржаўная агульнаадукацыйная сярэдняя школа № 19» *С. П. Емяльянава*

Умоўныя абазначэнні:

— правіла;
— інфармацыя пра мову і маўленне (чытае настаўнік);
— слоўнік;
Рм — заданне па развіцці маўлення;
— дамашняе заданне;
.. — пропуск адной літары або некалькіх літар;
... — пропуск слова

ISBN 978-985-465-772-1 (ч. 2)
ISBN 978-985-465-727-1

ГУКІ І ЛІТАРЫ

Цвёрдыя і мяккія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме

1. Вымавіце словы парамі. Якімі гукамі яны адрозніваюцца?

нос — нёс	стол — столь
воз — вёз	вугал — вугаль

столь — рус. *потоло́к*

Як перадаецца на пісьме мяккасць зычных гукаў?

Зычныя гукі бываюць цвёрдыя і мяккія. Мяккасць зычных гукаў на пісьме абазначаецца літарамі ***е, ё, ю, я, і, ь***: *верасень*, *клён*, *ліпа*, *зязюля*.

2. Прачытайце. Вымавіце выдзеленыя словы парамі. Якія гукі адрозніваюць значэнне аднаго слова ад другога?

Мой мядзведзік мае **моду**
Перад сном паесці **мёду.**

А грыбоў жа ў **бары!**
Самі просяцца: **бяры!**

Зноў карась разводзіць **плёткі:**
— Шчупака пабілі **плоткі.**
Н. Сторажава

разво́дзіць плёткі — *гавары́ць няпра́ўду*
ма́е мо́ду — *ма́е звы́чку*

Выпішыце выдзеленыя словы. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць мяккасць зычных гукаў на пісьме.

3. Разгледзьце форзацы. Назавіце парныя па цвёрдасці–мяккасці зычныя гукі. Які гук **[й']**? Які гук **[ў]**? Вымавіце словы *гара, гіра*. У якім слове гук **[г]** цвёрды, а ў якім мяккі?

4. У радзе літар знайдзіце назвы рыб.

шчупакарплоткакунёкарась



шч..к



пл..а



к..п

а..к



к..сь

Запішыце гэтыя словы. Назавіце словы, у якіх усе зычныя гукі цвёрдыя.

Назавіце словы з мяккімі зычнымі гукамі. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць мяккія зычныя гукі.

5. Прачытайце. Што трэба для рыбалкі?

Вось кручок, вось чарвячок,
лёска, палка — і рыбалка.
Закідай хутчэй, Міхалка.

У. Карызна

Спішыце. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць мяккасць зычных гукаў на пісьме.

6. Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся правільна вымаўляць яе.

Сам з сябе смяецца сом,
сом прысніў са смехам сон.

К. Камейша

Выпішыце словы, у якіх усе зычныя цвёрдыя. Назавіце словы, якія адрозніваюцца паміж сабой адным гукам.

7. Адгадайце загадку.

Сам маленькі і крывенькі,
важыць толькі грам,
ды ў рацэ, бывае, зловіць
рыбу з кілаграм.

к р ч о к у

Спішыце загадку. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць мяккія зычныя гукі.

8. Прачытайце. Устаўце ў сказы словы з дужак.

лотаць

Чмель стаміўся, сеў на ..., адпачне і будзе ... *(лотаць, лётаць)*.

У малога ... новенькія ... . *(Санькі, санкі) (Н. Сторажава)*.

Якімі гукамі адрозніваюцца словы ў дужках? Падкрэсліце літары, якімі адрозніваюцца гэтыя словы.

9. Прачытайце верш.

сусе́д

Люстэрка



Ва ўсіх рыбак-дзяўчат
карп люстра́ны — нарасхват.
Ці збіраецца **бяседа,**
ці гулянка ў **суседа** —
модніцы да карпа гужам:
ён люстэркам добрым служыць.

В. Зуёнак

гу́жам — *адзі́н за адны́м*
люстэ́рка — рус. *зе́ркальце*

Выпішыце выдзеленыя словы. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць мяккасць зычных.

10. Прачытайце прымаўку. Калі так гавораць?

Рыбка ў рацэ́ ды не ў руцэ́.

Назавіце словы, якія адрозніваюцца адным гукам. Назавіце зычныя гукі ў гэтых словах. Яны мяккія ці цвёрдыя?

11. Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся правільна вымаўляць яе.

Пайшоў Сёма лавіць сома,
Соня спіць спакойна дома.
Сёме — сом, Соні — сон.

Назавіце пары слоў, якія адрозніваюцца адным гукам. Запішыце пары слоў пад дыктоўку настаўніка.

Назавіце пару слоў, якая адрозніваецца гукамі **[с]**—**[с']**.

12. Прачытайце. Адгадайце загадку. З «рассыпаных» літар складзіце слова-адгадку.

Кіёк у руцэ,
а нітка ў рацэ.

Спішыце. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць цвёрдыя зычныя гукі.

Зычныя гукі [д]—[дз’]

13. Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся правільна вымаўляць яе. Назавіце першы гук у словах.

Дзіма дзіўна дзяліў дыню.

14. Адгадайце загадку. Цвёрдыя ці мяккія гукі абазначаюць выдзеленыя літары?

На гра**дз**е вялізны шар
падстаўляе сонцу твар.
На гра**д**у пайду, гэты шар сарву.

Запішыце загадку разам з адгадкай.

гарбу́з

15. Вымавіце словы парамі.

гара**д**ы — у гара**дз**е
бя**д**а — у бя**дз**е
ва**д**а — на ва**дз**е
дні — **дз**ень

Якія гукі абазначаюць выдзеленыя літары? Які з гукаў цвёрды, а які мяккі?

Гук **[д]** цвёрды, таму пасля літары ***д*** пішуцца ***а, о, у, э, ы***: ***до****м*, ***ды****м*.

Гук **[дз’]** мяккі, таму пасля ***дз*** пішуцца ***е, ё, ю, я, і, ь***: ***дзе****нь*, ***дзя****ўчынка*.

16. Прачытайце. Які злодзей пабываў у агародзе?

У бабулі ў агародзе
пабываў сягоння злодзей.
Ён качан капусты з’еў
і з удзячнасцю глядзеў
на бабулю і на дзеда.
— Мэ-э-э! Я смачна паабедаў.

Т. Кляшторная

Знайдзіце ў тэксце словы з гукам **[дз’]**, выпішыце іх. Падкрэсліце ***дз*** разам з наступнай літарай.

17. Прачытайце. Спачатку назавіце словы з гукам **[д]**, а потым — з гукам **[дз’]**.

Дзіна, дыня, Дзяніс, Дана, дзюба, дом, Даніла, дзяцел, дарога, дзень.

Запішыце пад дыктоўку настаўніка словы з **[дз’]**. Растлумачце правапіс вялікай літары ў словах.

18. Прачытайце. Назавіце словы з гукамі **[д], [дз']**.

Сапраўдны сябар не пакі-
не таварыша ў бядзе.

Спішыце. Падкрэсліце ***дз*** разам з наступнай літарай.

19. Паслухайце верш. Чаму дзяцей назвалі добрымі?

Ехалі дзеці аднойчы ў трамваі.
Месцы дарослым яны ўступалі,
дапамагалі сыходзіць старым.
— Добрыя дзеці, — казалі ўсе ім.
Т. Кляшторная

Назавіце словы, у якіх ёсць гук **[дз']**.

Рм Вусна адкажыце на пытанні.

1. Як трэба размаўляць у аўтобусе, трамваі, тралейбусе, метро?

2. Каму трэба ўступаць месца ў транспарце?

20. Паслухайце верш. Як Жора дапамагае дарослым? Як вы разумееце выраз: *ты для нас — апора*?

Апора

..ень без руху — нецікавы,
не люблю ся..ець без справы.
Я шпакам змайструю хатку,
маме я ўскапаю градку,
для дзядулі без сяброў
накалю гару я дроў.
Тата хваліць: «Дзякуй, Жора!
Ты для нас усіх — апора».

Запішыце выдзелены сказ. Устаўце прапушчаныя літары. Падкрэсліце літары, якія пішуцца пасля ***дз***.

Выпішыце слова ветлівасці, якое сустрэлася ў вершы.

Рм Раскажыце, якія справы вы любіце рабіць разам з дарослымі.

21. Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць? Назавіце словы з гукамі **[д], [дз’]**.

Садок пасадзіў — добрую справу зрабіў.

Запішыце прыказку пад дыктоўку настаўніка.

22. Адкажыце на пытанні, карыстаючыся словамі з правага слупка. Які гук вымаўляецца ў гэтых словах замест **[д]**?

Дзе жыве птушка?	у *(гняздо)*
Дзе плавае рыба?	у *(вада)*
Дзе расце рэдзька?	на *(града)*

Запішыце сказы. Растлумачце правапіс ***дз***.

23. Прачытайце. Спішыце, устаўце ***д*** або ***дз***.

— Калі ласка, ..якуй,
добры ..ень, —
ветлівыя словы
чую ад лю..ей.
Т. Кляшторная

Падкрэсліце ***дз*** разам з наступнай літарай.

24. Паслухайце верш. Які гук прапушчаны ў словах? Якімі літарамі трэба яго абазначыць?

Лыч задзёр у неба дзік:
дзіва — хо..іць мала..ік.
Дзік па небе не ха..іў —
дзік на градах насля..іў.
М. Чарняўскі

маладзік

Спішыце другі сказ, устаўце патрэбныя літары. Падкрэсліце ***дз*** разам з наступнай літарай.

Будзьце ўважлівыя!

па-беларуску	**па-руску**
ты́дзень	неде́ля
нядзе́ля	воскресе́нье

25. Адгадайце загадку.

Едзе кошка на шасці ножках, сама сёмая *(В. Вітка)*.

З «рассыпаных» складоў састаўце і запішыце слова-адгадку.

Вымавіце па парадку гукі і назавіце літары ў слове-адгадцы.

Рм Дапоўніце сказ патрэбным словам. Назавіце словы з гукам **[дз']**.

Сем дзён — гэта ... .

Запішыце сказ пад дыктоўку настаўніка. Падкрэсліце ў словах літары, якія пішуцца пасля спалучэння літар ***дз***.

26. Прачытайце назвы дзён тыдня. Размясціце іх па парадку.

Аўторак, сера..а, паня..елак, чацвер, субота, пятніца, ня..еля.

Спішыце. Устаўце ***д*** або ***дз***, растлумачце іх правапіс.

27. Змяніце словы ў дужках так, як патрабуе сэнс.

Цыбуля расце на *(агарод)*.
Грушы растуць у *(сад)*.
Вялікі завод ёсць у *(горад)*.

цыбу́ля

Запішыце адзін сказ на выбар. Назавіце слова з гукам **[дз’]**.

28. Прачытайце.

Дзве сяброўкі на гра..е
скачуць спрытна, як ні..е.
Хто прагоніць Зоську, Юльку?
Патапталі ўсю цыбульку.

Л. Фарботка

Спішыце першы сказ. Устаўце патрэбныя літары, растлумачце іх правапіс.

Зычныя гукі [т]—[ц’]

29. Прачытайце загадкі, адгадайце. Знайдзіце словы з гукамі **[т], [ц’]**. Вымавіце словы.

1. Жалезны конь, у жываце агонь, есці не просіць, арэ, жне і косіць.

2. Не матор, а гудзіць, не самалёт, а ляціць, не змяя, а джаліць.

чмель

Спішыце адну загадку. У дужках запішыце адгадку. Падкрэсліце ***ц*** разам з наступнай літарай.

30. Вымавіце словы парамі.

вертал**ё**т — на верталё**це**
бало**та** — на бало**це**
біле**т** — на біле**це**
рабо**та** — на рабо**це**

Якія гукі абазначаюць выдзеленыя літары? Які з гукаў цвёрды, а які — мяккі?

Гук **[т]** цвёрды, таму пасля літары ***т*** пішуцца ***а, о, у, э, ы***: *ле**т**а, ка**т**ы*.
Гук **[ц']** мяккі, таму пасля ***ц*** пішуцца ***е, ё, ю, я, і, ь***: *ле́**ц**ейка, ко**ц**ік*.

31. Прачытайце сказы.

Прыляцеў **самалёт. На самалёце** прывезлі пошту.
Касманаўты адправіліся ў **палёт. У палёце** ўсе адчуваюць сябе добра.
Тут **шахта**, у якой здабываюць калійную соль. **У шахце** працуюць шахцёры.

Выпішыце выдзеленыя словы парамі. Цвёрдыя ці мяккія гукі абазначаюць літары ***т***, ***ц*** у гэтых словах?
Знайдзіце ў сказах іншыя словы з гукам **[ц']**.

32. Прачытайце. Назавіце словы, у якіх ёсць гук **[т]** або **[ц']**. Як гэтыя гукі абазначаюцца на пісьме?

Села **Света** ў **ракету,**
абляцела вакол свету,
глянула на родны край —
каго хочаш выбірай.
У. Мацвеенка

Вусна змяніце выдзеленыя словы так, каб замест **[т]** вымаўляўся **[ц’]**.

Рм Калі вы карыстаецеся лічылкамі? Разлічыцеся пры дапамозе гэтай лічылкі.

33. Прачытайце скорагаворку. Назавіце словы з гукамі **[т]**, **[ц’]**.

Коцік-каток нітак клубок закаціў у куток.

Спішыце. Падкрэсліце ***ц*** разам з наступнай літарай адной рыскай.

34. Паслухайце скорагаворку. Назавіце словы з гукам **[ц’]**. Прачытайце.

— Цецярук, цецярук, дзе твая цяцера?
— Мая цяцера цецеранятам **цеста** месіць.

Змяніце выдзеленае слова так, каб замест **[т]** вымаўляўся **[ц’]**. Запішыце гэтыя словы.

35. Прачытайце тэкст. Калі да нас прылятаюць гракі?

Пryля..елі гракі. З вясёлым крыкам лётаю..ь яны над голымі дрэвамі. Адны шукаю..ь месцейка для гнязда, другія ладзя..ь старыя. Вунь грак нясе ў дзюбе галінку. Прыладзіў яе і паляцеў за другой. Хутка гняздо будзе гатова.

ла́дзяць — *папраўля́юць*
ме́сцейка — рус. *месте́чко*

Вымавіце словы з прапушчанымі літарамі. Які гук чуецца на месцы пропускаў? Якой літарай яго трэба абазначыць?

Спішыце сказы, у якіх ёсць словы з прапушчанымі літарамі.

Падкрэсліце ***ц*** разам з наступнай літарай.

Гаварыце правільна

Тэлефо́н, тэлеві́зар, камп'ю́тар

36. Прачытайце лічылку. Назавіце словы, у якіх ёсць гукі **[т]**, **[ц’]**.

Мы купілі тэлефон,
ды ў яго згубіўся звон.
Будзем мы адпачываць,
ну, а ты — той звон шукаць.

В. Швед

Разлічыцеся пры дапамозе лічылкі.

Рм **37.** Прачытайце. Вусна дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

Увечары ўсе адпачываюць. Дзядуля з бабуляй глядзяць … . Мама размаўляе па … . А Цімоша з татам гуляюць на … .

С л о в ы д л я д а в е д к і: *камп’ютары, тэлевізар, тэлефоне*.

Раскажыце, як вы адпачываеце.

38. Прачытайце загадку. Якія літары трэба ўставіць у словы?

Праз палі, масты, лясы
ля..яць словы-галасы.
Дзякуючы правадам
кажу..ь тут, а чую..ь там.

З «рассыпаных» складоў састаўце і запішыце слова-адгадку.

Запішыце першы сказ. Падкрэсліце ***ц*** разам з наступнай літарай адной рыскай.

39. Прачытайце. Якія літары трэба ўставіць у словы? Растлумачце іх правапіс.

Змайстраваў старэйшы **брат**
мне драўляны **самакат**.
Усміхнуўся, кажа ён:
— Ну, давай, бяры разгон!
Хоць імча..ь і страшнавата,
не магу падво..іць брата.

М. Мятліцкі

Выпішыце словы з прапушчанымі літарамі. Устаўце літары ***д*** або ***дз***, ***т*** або ***ц***.

Вусна змяніце выдзеленыя словы так, каб замест **[т]** вымаўляўся **[ц’]**.

Гаварыце правільна

старэйшы брат	старэйшы за сястру
малодшы брат	малодшы за сястру

40. Прыдумайце новыя словы па ўзоры. Запішыце.

У з о р: *брат* — *брацік*.

самалёт — …
верталёт — …
білет — …

ёсць

Рм Дапоўніце сказы словамі, якія падыходзяць па сэнсе.

У Тані ёсць маленькі … . Дзяўчынка зрабіла яму папяровы … .

Запішыце сказы.

41. Паслухайце верш. Што здарылася з паштальёнам? Як дзеці дапамаглі яму? Падумайце, хто яшчэ быў удзячны дзецям, акрамя паштальёна?

Падмянілі паштальёна

Захварэў наш паштальён
і не носі..ь **пошты** ён.
Стаў у мамы я прасі..ь:
— Можна пошту мне насі..ь?
— Што ж, нясі, — сказала мама.
Вучні класа ўсе таксама
пошту па чарзе насілі,
паштальёна падмянілі.
Акрыяў паштальён,
быў нам вельмі ўдзячны ён.

А. Дзеружынскі

Якія літары трэба ўставіць у словы? Якія гукі абазначаюць прапушчаныя літары? Змяніце выдзеленае слова так, каб замест **[т]** вымаўляўся **[ц’]**.

Спішыце першы сказ, падкрэсліце літару, якую ўставілі.

42. Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

Растлумачце правапіс выдзеленых літар. Запішыце прыказку пад дыктоўку настаўніка.

Зробіш люд**дз**ям **д**абро — і **т**абе адго**дз**я**ць**.

адгадзі́ць — рус. *отблагодари́ть, отплати́ть*

43. Прачытайце прыказкі. Што лягчэй зрабіць: паабяцаць ці выканаць? Якія літары трэба ўставіць у словы? Растлумачце іх правапіс.

Не так лёгка зрабі..ь, як сказа..ь.
Языком мало..ь — не дровы кало..ь.

Спішыце прыказкі, устаўляючы патрэбныя літары.

Няпарныя цвёрдыя зычныя гукі. Правапіс слоў з імі

44. Прачытайце словы.

Жыта, **дж**ала, **р**аніца, **ч**апля, **ш**эрсць, **ц**ырк, **ж**ук.

Выразна вымавіце першы гук у кожным слове. Ён цвёрды ці мяккі?

Якія літары пішуцца пасля выдзеленых літар?

Цвёрдыя зычныя гукі **[р]**, **[ж]**, **[ш]**, **[ч]**, **[дж]**, **[ц]** не маюць парных мяккіх гукаў.

Пасля літар ***р, ж, ш, ч, ц*** і спалучэння літар ***дж*** пішуцца ***э, о, у, а, ы***: ***жо****луд*, ***рэ****ха*, ***цы****буля*, ***ша****фа*, ***ру****ка*, ***джэ****м*.

45. Разгледзьце стужку гукаў. Якія гукі толькі цвёрдыя і ў рускай, і ў беларускай мовах?

[р]	[ж]	[ш]	[ч]	[дж]	[ц]

46. Дапоўніце словы ў слупках патрэбным складам ці літарай. Што абазначаюць гэтыя словы?

ба	**ка**	**г**
..ян	дуд..	..ітара
..рабан	скрып..	..услі
..лалайка	жалей..	

Выпішыце словы з няпарнымі цвёрдымі зычнымі гукамі. Назавіце гэтыя гукі. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць няпарныя цвёрдыя зычныя гукі і галосныя пасля іх.

47. Прачытайце верш. Правільна вымавіце няпарныя цвёрдыя гукі **[ч], [р]**.

Дударык

Сеў у полі на каменьч..ку,
узяў дудку на р..меньч..ку.
Ду-ду-ду — дуда гудзе,
полем водгалас ідзе.

В. Вітка

Спішыце першы сказ. Падкрэсліце літары, якія ўставілі, растлумачце іх напісанне.

48. Прачытайце верш. Ці правільна зайчык вывучыў ноты? Што выклікала ў вас усмешку?

Зайчыкавы ноты

У музычнай школе
зайчык дзень **прабыў.**
— До-рэ-мі-фасоля! —
ноты ён **вучыў.**
Потым ля загона
рваў стручкі за трох.
І спяваў натхнёна:
— До-рэ-мі-**гарох**!

В. Гардзей

Выпішыце выдзеленыя словы. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць няпарныя цвёрдыя зычныя гукі і галосныя пасля іх.

49. Спішыце скорагаворку. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць няпарныя цвёрдыя зычныя гукі.

Б'е баран у барабан,
барабаншчык наш баран.

А. Вольскі

50. Прачытайце скорагаворкі. Навучыцеся правільна вымаўляць іх.

Цэлы тыдзень міла-лю́ба
грэлася пад сонцам бульба.

Шэпча, шэпча небыліцы
раніцай жыта пшаніцы.

За шырокім шэрым тынам
узрушана шуміць шыпшына *(С. Шах)*.

тын — рус. *забо́р*
шыпшы́на — рус. *шипо́вник*

Выпішыце словы з няпарнымі цвёрдымі зычнымі гукамі **[ж]**, **[ш]**, **[ц]**.

Падкрэсліце літары, якія абазначаюць няпарныя цвёрдыя зычныя гукі і галосныя пасля іх.

Будзьце ўважлівыя!

У беларускай мове пішам:

жыво́т	**шы́**шка	**цэ**ме́нт
жэле́	**шэ**сць	**цэ**х

51. Паслухайце тэкст. З чаго раней выраблялі ручнікі? Як іх упрыгожвалі?

Ручнікі ўж..ваюць на Беларусі з даўніх часоў. Асноўнымі іх колерамі заўсёды былі белы і ч..рвоны. Раней ручнікі ткалі з лёну на кроснах, упрыгожвалі выш..ўкай, кару́нкамі. Імі карысталіся кожны дзень. Без прыгож..х ручнікоў не абыходзілася ніводная важная падзея ў жыцці ч..лавека.



кро́сны — *тка́цкі стано́к*
кару́нкі — рус. *кру́жево*

ручні́к

Якія літары трэба ўставіць у словы? Растлумачце іх правапіс.

Выпішыце словы з прапушчанымі літарамі. Падкрэсліце літары, якія ўставілі.

52. Прачытайце верш. Для чаго мы выкарыстоўваем ручнік? Чаму паэтэса параўноўвае сонейка з ручніком?

Залаты ручнік

Росныя травінкі
падстаўляюць спінкі
залатому ручніку —
сонейку.

А. Кобец-Філімонава

Рм Дапоўніце сказы слоўнікавым словам. Запішыце.

На кухні матуля павесіла прыгожы … . Гэты … вышывала мая бабуля.

Падкрэсліце літары, якія абазначаюць няпарныя цвёрдыя зычныя гукі і галосныя пасля іх.

53. Прачытайце тэкст. Як вы віншуеце матуль з днём нараджэння?

Наташ..на бабуля выш..вае прыгож..я абрусы, ручнікі. Яна навучыла і ўнучку. Дзяўчынка выш..вае сурвэтку. Наташа рыхтуе падарунак матулі да дня нараджэння.

абру́с — рус. *ска́терть*

Растлумачце правапіс прапушчаных літар. Спішыце сказы, у якіх ёсць словы з прапушчанымі літарамі. Падкрэсліце літары, якія ўставілі.

54. Прачытайце. Чаму так гавораць?

Чуж..м розумам не праж..веш.
Шануй старэйш..х, барані малодш..х.

Растлумачце правапіс прапушчаных літар. Спішыце. Падкрэсліце літары, якія ўставілі.

55. Прачытайце словы першага слупка. Які гук абазначаюць выдзеленыя літары?

цуд	*біле**т** — біле**ц**ік*
цырк	кус**т** — ...
цацка	бан**т** — ...

Прачытайце словы другога слупка. Які гук абазначаюць выдзеленыя літары?

Змяніце словы другога слупка па ўзоры. На які гук змяняецца **[т]** пры змякчэнні?

У беларускай мове ёсць цвёрды гук [ц] і мяккі гук [ц’]. Яны не ўтвараюць пары па цвёрдасці–мяккасці.

56. Прачытайце. Выпішыце словы, у якіх літара ***ц*** абазначае няпарны цвёрды зычны гук. Падкрэсліце літары, якія пішуцца пасля ***ц***.

Сцяна, цукар, вецер, раніца, касцёр, цэгла, сцюжа, цымбалы, цішыня.

цэ́гла — рус. *кирпи́ч*

57. Прачытайце верш.

Жабіны канцэрты

На балоце, пры рацэ,
дзіўны хор дае канцэрт.
— Ква-ква-ква! —
пяе балота.
Не канцэрт — адна смяхота!
— Ква-ква-ква! —
гайдае долы.
Слухайце КВАнцэрт вясёлы.

К. Камейша

Выпішыце ў адзін слупок словы з няпарным цвёрдым гукам **[ц]**, а ў другі — словы з мяккім гукам **[ц’]**.

58. Прачытайце. Назавіце словы з мяккім гукам **[ц’]**.

Вось загадка для Андрэйкі:
там і шпалы ёсць, і рэйкі,
малаточкі па іх б’юць
і мелодыю вядуць.

У. Мацвеенка



Запішыце загадку разам з адгадкай. Падкрэсліце слова з цвёрдым гукам **[ц]** .

59. Прачытайце прыказку. Якому чалавеку можна лёгка ўсё растлумачыць?

Разумнай галоўцы досыць два слоўцы.

до́сыць — *дастатко́ва*

Запішыце прыказку пад дыктоўку настаўніка. Падкрэсліце літару, якая абазначае мяккі гук **[ц’]**, адной рыскай. Літару, якая абазначае няпарны цвёрды **[ц]**, падкрэсліце дзвюма рыскамі.

60. Прачытайце. Спішыце.

Маме падарунак —
моцны пацалунак,
сястры — усмешка,
брату — пацешка.

Н. Галіноўская

Падкрэсліце літару ***ц***, якая абазначае мяккі гук **[ц’]**, адной рыскай. Літару ***ц***, якая абазначае няпарны цвёрды **[ц]**, падкрэсліце дзвюма рыскамі.

Звонкія і глухія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме

Успомніце з урокаў рускай мовы

Якія зычныя гукі з’яўляюцца звонкімі, а якія глухімі? Прывядзіце прыклады зычных гукаў, якія вымаўляюцца з голасам і шумам; толькі з шумам.

61. Паслухайце словы.

борт — **п**орт
зала — **с**ала
дзерці — **ц**ерці
жар — **ш**ар
дачка — **т**ачка
Джэк — **ч**эк

Прачытайце словы парамі. Якія зычныя гукі ў пачатку слова вымаўляюцца звонка, а якія — глуха?

Большасць звонкіх і глухіх зычных гукаў утвараюць пары:

[б]	[б’]	[г]	[г’]	[д]	[дз’]	[з]	[з’]	[ж]	[дж]
[п]	[п’]	[х]	[х’]	[т]	[ц’]	[с]	[с’]	[ш]	[ч]

62. Разгледзьце стужку гукаў. Назавіце звонкія і глухія зычныя гукі, якія ўтвараюць пары.

63. Замяніце ў пачатку слоў звонкія гукі на парныя глухія. Запішыце словы.

Біць, дзень, баліць, борт, брама

бра́ма — рус. *воро́та*

Падкрэсліце літары, якія абазначаюць парныя глухія гукі ў пачатку слоў.

64. Прачытайце сказы. Выпішыце пары слоў, якія адрозніваюцца парнымі звонкімі–глухімі зычнымі.

Дзядзька Глеб малоціць хлеб *(Н. Сторажава)*.

У гарачы дзень мы хаваемся ў цень *(Н. Сторажава)*.

Ля вадзіцы блізка лёгка скача пліска *(С. Шушкевіч)*.

Падкрэсліце літары, якімі адрозніваюцца гэтыя словы.

65. Паслухайце верш. Якое свята мы адзначаем у пачатку вясны? Чаму вясна ў Надзі атрымалася падобнай на матулю?

Надзя ў альбоме вясну малявала —
гожая дужа вясна паўставала.
Вобраз вясны атрымаўся жаночы:
мілая ўсмешка, чароўныя вочы,
кропкі вяснушак ля ясных вачэй,
шчокі палаюць за сонца ярчэй,
ну а на шчоках — вясёлыя ямачкі, —
Надзя пісала малюнак свой з мамачкі.

В. Жуковіч

Спішыце першы сказ. Якія гукі абазначаюць выдзеленыя літары? Назавіце парныя ім звонкія або глухія зычныя гукі.

Рм Прачытайце словы з верша, якія дапамагаюць апісаць Надзіну маму. Апішыце сваю матулю.

66. Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

Матуліны рукі заўсёды мяккія.

Назавіце парныя звонкія або глухія зычныя гукі ў словах.

Запішыце прыказку.

67. Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць яе.

Знайшоў зайчык сайкі акрайчык. Цешыўся зайка: сайка-кусайка.

М. Чарняўскі

Спішыце. Падкрэсліце пару слоў, якая адрозніваецца парнымі звонкімі–глухімі гукамі. Назавіце гэтыя гукі.

68. Прачытайце словы. Правільна вымавіце гукі на месцы выдзеленых літар.

[б] [п]
гры**б**ы — гры**б**

[п] [б]
ры**б**ка — ры**б**а

[д] [т]
пла**д**ы — пло**д**

[т] [д]
гра**д**ка — гра**д**а

[ж] [ш]
на**ж**ы — но**ж**

[ш] [ж]
лы**ж**ка — лы**ж**ачка

[з] [с]
гарбу**з**ы — гарбу**з**

[с] [з]
ка**з**ка — ка**з**ачка

Як вымаўляюцца звонкія зычныя гукі перад галоснымі? Як вымаўляюцца гэтыя зычныя на канцы слоў і перад глухімі зычнымі?

Для праверкі слоў з парнымі звонкімі–глухімі зычнымі ў канцы і ў сярэдзіне слоў трэба змяніць слова так, каб пасля зычнага стаяў галосны гук: *сцежка* — *сце**ж**ачка*, *ка**ш**ка* — *ка**ш**а*.

69. Прачытайце словы. Якія літары трэба пісаць на месцы пропускаў? Чаму? Спішыце пары слоў, устаўце прапушчаныя літары.

халады — хола..
чыжы — чы..
маразы — маро..

арэхі — арэ..
браты — бра..
кашы — ко..

70. Прачытайце верш. Як хлопчык дапамагаў маме пячы пірог?

З мамай мы **піро*(г/х)*** пяклі
так старанна, як маглі.
Маме я дапамагаў:
ёй рэцэпт услых чытаў.
Лё*(г/х)* на стол **піро*(г/х)*** духмяны,
зверху — зорачкі-бананы.
Маме зноў я **дапамо*(г/х)*** —
першым каштаваў піро*(г/х)*.

Т. Сучкова

Вусна змяніце выдзеленыя словы так, каб пасля зычнага стаяў галосны гук.

Выпішыце гэтыя словы, устаўце патрэбныя літары і падкрэсліце іх.

Будзьце ўважлівыя!

у рускай мове		у беларускай мове	
[г]	[к]	[г]	[х]
пиро**г**á — пирó**г**		піра**г**á — пірó**г**	

71. Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

Пакуль пірог не спёкся — гасцей не заві.

Дарагі не **абе*(т/д)***, а **прыве*(т/д)***.

Вусна змяніце выдзеленыя словы так, каб пасля зычнага стаяў галосны гук. Якія літары трэба ўставіць у словы?

Запішыце другую прыказку пад дыктоўку.

72. Прачытайце спалучэнні слоў. Якія літары трэба ўставіць у словы замест пропускаў? Вусна падбярыце праверачныя словы.

белы гры..*(б/п)*

захварэў на гры..*(б/п)*

смачны пло..*(д/т)*
драўляны пло..*(д/т)*



ле..*(з/с)* на дрэва
густы ле..*(з/с)*

шэры ко..*(д/т)*
складаны ко..*(д/т)*

73. Прачытайце. Вусна падбярыце праверачныя словы.

Блішчаць расою ле*(с/з)* і долы,
у чырвані гарыць усхо*(д/т)*.
Прачнуліся пад спеў вясёлы
і лу*(г/х)*, і са*(д/т)*, і агаро*(д/т)*.

А. Вольскі

Спішыце, устаўце патрэбныя літары.

74. Прачытайце словы. Якія літары трэба ўставіць на месцы пропуску? Чаму?

грыбы — гры..кі
лёгенькі — лё..кі

дзядзечка — дзя..ька
бяроза — бяро..ка

радок — ра..кі
піражок — піра..кі

Спішыце пары слоў, устаўце прапушчаныя літары.

75. Прачытайце верш. Вусна змяніце выдзеленыя словы так, каб пасля зычнага стаяў галосны гук.

Я стаю на **бера*(ж/ш)*ку**,
а рачулка льецца.
Ры*(п/б)*ка плавае ў вадзе,
сонейка смяецца.
У. Карызна

Спішыце. Устаўце ў словы патрэбныя літары.

76. Дапоўніце словы прапанаванымі літарамі.

	ш	
мі	..	ка
	с	

	з	
ка	..	ка
	с	

	д	
ра	..	кі
	ж	

	ш	
ко	..	ка
	с	

	ж	
но	..	ка
	ч	

Якія гукі абазначаюць устаўленыя літары?

Вусна змяніце словы так, каб пасля зычнага стаяў галосны гук.

77. Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

У студню вады не льюць, а ў **лес** дроў не вязуць.

сту́дня — *кало́дзеж*

Назавіце ў выдзеленым слове літару, напісанне якой трэба праверыць.

78. Адгадайце загадку. Спішыце. Устаўце патрэбныя літары, вусна падбярыце праверачныя словы.

Па лу*(ж/ш)*ку ідзе цыбаты,
уцякаюць жабяняты.
Уцякаюць жа*(б/п)*кі,
аж мільгаюць ла*(б/п)*кі.

А. Дзеружынскі

Падкрэсліце літары, якія ўставілі.

Звонкія зычныя **[й], [ў], [р], [м], [м’], [н], [н’], [в], [в’], [л], [л’]** не маюць парных глухіх.
Глухія зычныя **[к], [к’], [ф], [ф’]** не маюць парных звонкіх.

Будзьце ўважлівыя!

У беларускай мове

звонкія	глухія
[в]	[ф]
[в’]	[ф’]

не ўтвараюць пары.

79. Прачытайце верш. Якія змены адбываюцца ў прыродзе з надыходам вясны? Якія фарбы выкарыстоўвае Красуня-Вясна?

Спытала Ганулька ў кветак і траў:
— Скажыце, хто **лу(г/х)** так прыгожа прыбраў?
Гаворыць дзяўчынцы вятроў гамана:
— Лугамі хадзіла Красуня-Вясна!

Спытала Ганулька ў шумных палёў:
— Хто фарбы такое пяшчоты знайшоў?
— І чуе ў **адка(з/с)** зноў такое яна:
— Палямі хадзіла Красуня-Вясна!

М. Мятліцкі

гама́на — *шум*

адка́з

У другім слупку знайдзіце словы з няпарнымі глухімі зычнымі гукамі.

Вусна падбярыце да выдзеленых слоў праверачныя словы. Выпішыце выдзеленыя словы, устаўце патрэбныя літары.

80. Адгадайце загадку.

Паўз дарогі сталі ў рад
сёстры, нібы на парад,
у сукенках белых, вузкіх,
у зялёных пышных блузках.

Спішыце загадку. У дужках напішыце адгадку. Падкрэсліце ў словах літары, напісанне якіх трэба правяраць. Вусна падбярыце праверачныя словы.

Назавіце словы, у якіх ёсць няпарныя звонкія зычныя гукі.

81. Прачытайце тэкст. Якія кветкі першымі расцвітаюць вясной?

Пралеска

Яшчэ ляжыць снег у лесе, але ўжо дзе-нідзе зелянее траўка. На ўскрайку лесу глянула сіненькім вочкам пралеска. Яна самая першая кветка вясны. Пралеска ветліва ківае галоўкай на тонкай зялёнай ножцы.

Назавіце словы з няпарнымі глухімі зычнымі гукамі.

Назавіце ў словах літары, напісанне якіх трэба правяраць.

Выпішыце словы з парнымі звонкімі–глухімі зычнымі гукамі. Падбярыце да іх праверачныя словы.

У з о р: *снег* — *снегу*.

82. Замяніце выдзеленыя словы словамі з процілеглым значэннем.

горкі перац — *салодкі перац*
густы лес — ...
шырокая рака — ...
высокае дрэва — ...

Запішыце новыя спалучэнні слоў. Падкрэсліце літары, напісанне якіх трэба праверыць. Вусна падбярыце праверачныя словы.

83. Прачытайце народную прыкмету.

Гром на голы ле*(з/с)* — вясна халодная.

Спішыце, устаўляючы патрэбную літару. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць няпарныя звонкія зычныя гукі.

Падоўжаныя зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме

84. Параўнайце вымаўленне слоў. У якіх словах гукі вымаўляюцца падоўжана?

каме**нь** — каме**нне**
кры**ло** — кры**лле**
кола**с** — кало**сс**е
но**ч** — но**чч**у

Як передаецца на пісьме падоўжанае вымаўленне зычных гукаў?

Гукі **[ж], [ш], [з’], [с’], [л’], [н’], [ц’], [ч], [дз’]** паміж галоснымі могуць вымаўляцца падоўжана. Падоўжанае вымаўленне гукаў на пісьме передаецца дзвюма літарамі: *Пале**сс**е, збо**жж**а, заці**шш**а*.

85. Паслухайце тэкст. Назавіце прыметы вясны.

Надыход вясны

Ва ўсім адчуваўся надыход вясны. Сонечнае праменне саргравала зямлю. З да-

лёкага падарожжа вярнуліся шпакі. Усё наваколле патанула ў птушыных спевах.

Выпішыце словы з падоўжанымі зычнымі гукамі.

86. Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі з правага слупка.

Сава вылятае на паляванне	*ноччу*
Пчолы жывуць у	*зацішша*
Перад навальніцай бывае	*вуллі*

Назавіце падоўжаныя зычныя гукі ў словах.

Спішыце, падкрэсліце літары, якімі яны абазначаюцца.

87. Прачытайце прыказкі. Што з'яўляецца сапраўдным багаццем чалавека?

Навука — найлепшае бага*(ц/цц)*е.

Не ганарыся зва*(н/нн)*ем, а ганарыся ведамі.

Назавіце словы з падоўжанымі зычнымі гукамі. Выберыце літары, якія трэба ўставіць у словы.

Запішыце словы з падоўжанымі зычнымі.

88. Прачытайце. Адгадайце загадку. Выберыце літары, якія трэба ўставіць у словы.

Стракатуха прыляцела
і на даху дома села.
Не жы*(ц/цц)*ё — адна марока,
як пачне трашчаць ... .

Н. Парукаў

Запішыце апошні сказ загадкі разам з адгадкай.

Падкрэсліце літары, якія абазначаюць падоўжаны гук **[ц']**.

89. Вымавіце словы.

стаго**ддз**е паўго**ддз**е су**ддз**я

Які гук вымаўляецца падоўжана? Як падаўжэнне гука **[дз']** перадаецца на пісьме?

Запішыце словы.

Падоўжаны гук **[дз']** на пісьме абазначаецца спалучэннем літар ***ддз***: *разво**ддз**е, ла**ддз**я.*

90. Прачытайце. Устаўце ў сказы патрэбныя словы. Назавіце падоўжаныя зычныя гукі ў словах.

Трашчыць … . З … прадзіраецца з гушчару нешта вялікае, дужае. **Выходзіць зубр і спыняецца ў … .** Вялікая галава, шырокія грудзі здзіўляюць сваёй … і магутнасцю *(Паводле В. Вольскага)*.

Словы для давед кі: *задуменні, галлё, фырканнем, веліччу*.

Запішыце выдзеленыя сказы, устаўляючы патрэбныя словы. Падкрэсліце літары, якімі абазначаюцца падоўжаныя зычныя гукі на пісьме.

91. Вусна дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

У лесе шмат сухога … . Зялёным лісцем пакрываюцца … . *(галля, галінкі)*
У гушчар не пранікае сонечнае … . Першы сонечны … асвяціў палянку. *(праменне, прамень)*

Назавіце ў словах падоўжаныя зычныя гукі.

92. Прачытайце. Якія літары прапушчаны? Якія гукі яны абазначаюць?

Ціха і цёмна ў пушчы.
Пахне грыбамі і цві..ю.

Здалёк пачулася чвяка..е. Гэта дзікі. Яны пакрыты чорным шчаці..ем. Галава ў дзіка доўгая, як у сві..і.

цвіль — рус. *пле́сень*

Як выглядаюць дзікі? Спішыце сказы, якія даюць адказ на гэтае пытанне. Падкрэсліце літары, якія ўставілі, растлумачце іх правапіс.

93. Прачытайце. Выберыце літары, якія трэба ўставіць у словы.

Ох, і цёмна ж но*(ч/чч)*у ў пушчы:
ельнік стаў яшчэ гусцей.
Лось га*(л/лл)*ё сухое трушчыць
і чапляецца часцей.

С. Грахоўскі

Спішыце апошні сказ.

Будзьце ўважлівыя!

у рускай мове у беларускай мове пішам

белору**сс**кий кла**сс**	белару**с**кі кла**с**

94. Прачытайце тэкст. Якія літары трэба ўставіць у словы? Запішыце гэтыя словы. Растлумачце іх правапіс.

На ўроках белару..кай мовы мы вучым новыя словы. На матэматыцы займаемся лічэ..ем. На ўроках фізкультуры вучні нашага кла..а любяць гуляць у валейбол. Су..ёй бывае настаўнік фізкультуры.

А самы вясёлы час у школе — гэта перапынак.

Словы з падоўжанымі зычнымі гукамі можна пераносіць на наступны радок так: *гал-лё*, *га-ллё*.

95. Паслухайце верш. Выберыце літары, якія трэба ўставіць у словы.

На лужку зарэчным гра*(н/нн)*е
ды вясёлае гуля*(н/нн)*е:
сёння нараджэ*(н/нн)*я дзень
адзначае авадзень.

С. Бестава

Выпішыце словы з падоўжанымі зычнымі гукамі, падзяліце іх для пераносу.

во́кладка

96. Разгадайце рэбус.

Дапоўніце сказ неабходным словам.

У падручніка па **чыта*(н/нн)*і** прыгожая ... .

Спішыце сказ. Выдзеленае слова падзяліце для пераносу.

97. Прачытайце небыліцу. Расстаўце словы на свае месцы.

У гародзе цвіце рак,
пад карчом схаваўся мак.
З норкі пазірае мішка.
З вуллёў мёд цягае мышка.

Т. Тарасава

Назавіце слова з падоўжаным зычным гукам.

У якіх словах трэба праверыць правапіс парных звонкіх–глухіх зычных? Вусна падбярыце да іх праверачныя словы.

98. Прачытайце. Выберыце літары, якія трэба ўставіць у слова.

Сакавік — месяц абуджэ*(н/нн)*я прыроды ад зімовага сну.

Спішыце. Слова з падоўжаным зычным гукам падзяліце для пераносу.

Раздзяляльныя знакі — апостраф (’) і мяккі знак (ь)

99. Прачытайце словы. Параўнайце іх вымаўленне.

пяро — пер’е
верабей — вераб’і

сям’я
куп’ё

куп’ё — рус. *ку́пчики*

У якіх словах паміж зычным і галосным вымаўляецца гук **[й]**? Выпішыце гэтыя словы. Падкрэсліце літары, перад якімі пішацца апостраф.

Апостраф пішацца пасля літар, якія абазначаюць цвёрдыя зычныя гукі, перад літарамі ***е, ё, ю, я, і***: *надвор’е, сур’ёзны, п’ю, аб’ява, вераб’і*.

100. Прачытайце. Правільна вымавіце словы з апострафам.

Стаіць цёплае **надвор’е**. Бабуля выйшла ў агарод і рве бур’ян. Унучкі Мар’я і Дар’я дапамагаюць ёй.

Выпішыце словы з апострафам. Падкрэсліце літары, паміж якімі пішацца апостраф. Вымавіце па парадку гукі, назавіце літары ў выдзеленым слове.

надво́р'е

101. Прачытайце народную прыкмету. Запомніце яе.

Поўня светлая і чыстая — на добрае надвор'е.

по́ўня — *по́ўны ме́сяц*

Запішыце сказ па памяці. Падкрэсліце літары, паміж якімі пішацца апостраф.

102. Разгадайце рэбусы і дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

У нас дружная ... .



Стаіць веснавое ... .

103. Прачытайце. У якія словы трэба ўставіць апостраф замест кропак?

Пад..ехаў да гары Тарас.
На горку ўз..ехаў. З..ехаў раз
і за..явіў: «Круты пад..ём!
Па..едзем у аб..езд — кругом!»

А. Базілінская

Выпішыце словы з апострафам. Падкрэсліце літары, паміж якімі пішацца апостраф.

104. Прачытайце. Якія літары або знак трэба ўставіць у словы замест пропускаў? Растлумачце іх правапіс.

Паміж дрэў — дыван куп..я,
тут — зубрыная сям..я.
Бацька-зубр на мох прылё..,
аб пянёк пачухаў ро.. .

В. Коўтун

Спішыце. Падкрэсліце літары, паміж якімі пішацца апостраф.

Успомніце з урокаў рускай мовы

Для чаго служыць мяккі знак *(ь)*? Назавіце словы, у якіх мяккі знак абазначае мяккасць папярэдніх зычных.

105. Прачытайце сказы. Вымавіце выдзеленыя словы парамі.

1. Я **палю** кветкі разам з мамай. Увечары я **палью** іх вадой.

2. Мы з татам варым бульбу. Я **салю** яе. Калі бульба зварыцца, я **салью** ваду.

У якіх словах паміж зычным і галосным вымаўляецца гук **[й]**?

Назавіце літары, пасля якіх пішацца раздзяляльны ***ь***.

Мяккі знак можа не толькі абазначаць мяккасць зычных гукаў на пісьме *(пісьмо, камень)*. Ён можа паказваць, што паміж зычным і галосным гукамі вымаўляецца гук **[й]**. Тады яго называюць раздзяляльным ***ь***.

106. Адгадайце загадку.

Ірву я шкодную траву з **лю**,
вадою кветкі напаю з **лью**.

..лю

..лью

Запішыце словы-адгадкі.

Падкрэсліце літары, паміж якімі пішацца раздзяляльны ***ь***.

Раздзяляльны мяккі знак пішацца пасля літар ***л***, ***н***, ***з***, ***с***, ***ц***, спалучэння літар ***дз*** перад ***е***, ***ё***, ***ю***, ***я***, ***і***: *льецца*, *Афанасьеў*, *парцьеры*.

107. Прачытайце. Выпішыце словы з раздзяляльным мяккім знакам. Падкрэсліце літары, паміж якімі пішацца раздзяляльны ***ь***.

Ульяна Афанасьева, пісьмо, паштальён, льецца, вугалькі, мільён.

Рм Раскажыце аб прафесіі паштальёна. Выкарыстайце словы:

часопіс

ліст

паштоўка

газета

Як па-іншаму можна назваць ліст?

108. Прачытайце. Адгадайце загадку. Што трэба ўставіць у словы замест пропускаў: раздзяляльны ***ь*** ці апостраф?

Што за домік без акон? Жыхароў у ім — міл..ён. Дружна, мірна з веку ў век тут адна сям..я жыве.

109. Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі. Пры спісванні ўстаўце раздзяляльны ***ь*** або апостраф.

У Дар’і дружная … . Бацьку дзяўчынкі завуць … . Маці — … . Ёсць у яе сястра … .

Словы для даведкі: *сям..я, Мікалай Васіл..евіч, Мар..я Пятроўна, Ул..янка.*

110. Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

І ў вераб..я свая сям..я.

Што трэба ўставіць у словы замест пропускаў: раздзяляльны ***ь*** ці апостраф? Запішыце прыказку пад дыктоўку настаўніка.

111. Адгадайце загадку. Спішыце, устаўце замест пропускаў раздзяляльны ***ь*** або апостраф.



Голас тонкі, нос доўгі.
Хто яго заб..е, сваю кроў прал..е.

112. Адгадайце загадку.

За нас раней ён **устае**
і звонкі голас падае.
Звініць настойліва, вясёла:
— Пад'ём! Цябе чакае школа.

Н. Галіноўская

Запішыце слова-адгадку, падзяляючы яго для пераносу. Як падзяліць для пераносу слова *пад'ём*?

Апостраф і мяккі знак пры пераносе не аддзяляюцца ад папярэдняй літары: *пад’-ём, Уль-яна.*

113. Прачытайце. Што трэба ўставіць у словы замест пропускаў?

Паштал..ён, Дар..я, звяр..ё, б..ецца, міл..ён, л..ецца.

Выпішыце спачатку словы з раздзяляльным ***ь***, потым з апострафам, падзяляючы іх для пераносу.

114. Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

Напалоханая варона і **вераб..я** баіцца.

Што трэба ўставіць на месцы пропуску? Як падзяліць выдзеленае слова для пераносу? Запішыце прыказку пад дыктоўку настаўніка.

115. Назавіце адным словам. Запішыце гэтыя словы, падзяляючы іх для пераносу.

Група зорак на небе.	*пер..е*
Птушыная «вопратка».	*сузор..е*

116. Прачытайце сказы. Словы ў дужках замяніце так, як патрабуе сэнс.

Пер’е ў *(верабей)* шэрае.
Коні сытыя *(біць)* капытамі.

Запішыце сказы, падзяляючы словы з апострафам для пераносу. Назавіце слова, якое нельга падзяліць для пераносу.

117. Спішыце сказ, устаўляючы патрэбны раздзяляльны знак. Падзяліце для пераносу выдзеленыя словы.

Кураняты з **вераб..ямі** дружна **п..юць** вадзіцу з ямы.

ме́сца

118. Прачытайце легенду.

Адкуль назва горада

Там, дзе цяпер стаіць ***(Г/г)*омель**, пасярэдзіне ракі ***(С/с)*ож**, некалі было намыта шмат пяску. На беразе каля гэтага месца заўсёды стаяў чалавек. Каб плыты і лодкі не ўзбіваліся на мель, ён крыкам папярэджваў:

— Го! Мель! Го! Мель!
Вось і пайшло — *(Г/г)*омель.

Адкуль у горада Гомеля такая назва?

Рм Што вы ведаеце пра паходжанне назвы сваіх горада, вёскі?

Выпішыце выдзеленыя словы, растлумачце іх правапіс. Вымавіце па парадку гукі, назавіце літары ў слове *месца.* Колькі ў ім складоў?

119. Прачытайце верш. Якія літары трэба ўставіць у словы? Растлумачце правапіс ***е, ё — я***.

Каб помнілі

Ад дз..доў, ад прадз..даў,
ад в..коў сівых
нам у памяць дадз..на
слава дз..н былых.
Каб мы зналі-ведалі,
як даўней жылі,
над якімі бедамі
ўзрасці змаглі.

В. Кажура

Спішыце першы сказ, устаўляючы патрэбныя літары.

120. Прачытайце пацешку. Растлумачце правапіс літар ***д, дз***.

Ля ракі рыбачок-навічок
вуду жвавенька ўзяў на плячо.
Пахваліўся пры гэтым дзівак,
што ён спрытны, умелы рыбак.
Ды хваліцца не стаў рыбачок,
як сябе падчапіў на кручок.

В. Жуковіч

Спішыце выдзелены сказ. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць няпарныя цвёрдыя зычныя гукі.

121. Прачытайце сказы. Знайдзіце ў іх словы, якія адрозніваюцца адным гукам. Якімі літарамі адрозніваюцца гэтыя словы?

1. Я свой вывадак вяду на крынічную ваду.
2. Каля саду на лавачку сяду *(Н. Сторажава)*.

122. Адгадайце загадку.

Над зямлёю, над в..доюдою
тр..се белай бар..дою.
А як с..нейка ўсміхнецца,
ён р..сою разал*(ь/’)*ецца.

Выпішыце словы з прапушчанымі літарамі, растлумачце іх правапіс. Запішыце слова з раздзяляльным знакам.

Адкажыце на пытанні

1. Як абазначаюцца гукі на пісьме?

2. Якія словы пішуцца з вялікай літары?

3. Чым адрозніваюцца гукі **[ў]** і **[у]**? Калі пішацца літара ***ў***?

4. Як вызначыць, колькі складоў у слове?

5. Раскажыце правіла правапісу літар ***о, э — а*** ў беларускай мове. Прывядзіце прыклады.

6. Калі ў беларускай мове пішуцца літары ***е, ё — я***? Прывядзіце прыклады.

7. Як абазначаецца мяккасць зычных гукаў на пісьме?

8. Назавіце няпарныя цвёрдыя зычныя гукі.

9. Як праверыць правапіс слоў з парнымі звонкімі ці глухімі гукамі на канцы ці ў сярэдзіне слова?

10. Якія зычныя гукі ў беларускай мове могуць падаўжацца? Як абазначаюцца падоўжаныя зычныя гукі на пісьме? Прывядзіце прыклады.

11. Калі ў словах пішуцца апостраф і раздзяляльны мяккі знак?

СЛОВА

Значэнне слова

123. Назавіце адным словам.

Асобнае памяшканне з плітой для гатавання ежы.

Пакой, у якім спяць.

Будынак для жылля.

Мэбля, прызначаная для таго, каб на ёй спаць.

спальня
ложак
кухня
дом

Для называння прадметаў, з'яў навакольнага свету, дзеянняў, якасцей людзі карыстаюцца словамі. Кожнае слова мае пэўнае значэнне.

Успомніце!

У якім парадку размяшчаюцца словы ў слоўніках.

У **руска-беларускім** слоўніку побач з рускім словам даецца яго пераклад на беларускую мову. У **беларуска-рускім** слоўніку побач з беларускім словам даецца яго пераклад на рускую мову.

124. Пры дапамозе слоўніка перакладзіце словы *ковёр, диван, дверь* на беларускую мову.

Значэнне якіх слоў раскрываецца ніжэй?

1. Выраб з варсістай тканіны, які кладзецца на падлогу.
2. Мяккая мэбля са спінкай і падлакотнікамі.
3. Праём у сцяне для ўваходу і выхаду.

дзве́ры

Запішыце слова *дзверы* разам з яго значэннем.

Дзверы — ...

125. Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць яе.

Сядзіць рак на гары,
робіць дзверы для нары.
А малыя рачкі
ловяць плотак на кручкі.

Растлумачце значэнне слова *рачкі*. Вымавіце па парадку гукі і назавіце літары ў гэтым слове.

126. Адгадайце загадку. Перакладзіце слова *прысады* на рускую мову.

Домік летні
ля прысад,
агарод і спеўны сад
часта вельмі
клічуць нас
адпачыць у вольны час.

У. Мазго

Спішыце загадку. Падкрэсліце літары, напісанне якіх трэба праверыць. Вусна падбярыце праверачныя словы.

127. Прачытайце слова. Перастаўце літары ў ім так, як падказваюць лічбы. Ці змянілася значэнне слова?

3 4 1 2

Зала

Устаўце патрэбныя словы ў сказы:

... — гэта вялікі пакой для прыёму гасцей.

... — гэта доўгае гнуткае сцябло некаторых раслін.

128. Прачытайце. Чым адрозніваюцца словы? Ці аднолькава яны пішуцца?

за́мкі — замкі́

Вусна дапоўніце сказы.

Палацы, у якіх жывуць каралеўскія асобы, — гэта ... .

Прыстасаванні для таго, каб зачыняць што-небудзь ключом, — гэта ... .

129. Запішыце загадку разам з адгадкай. Чым адрозніваюцца выдзеленыя словы?

Я з металу **рукі** маю,
карабель за нос трымаю.
А апусцяць — тры **рукі**
разгарну на дне ракі.

У. Мацвеенка

Словы, якія называюць прадметы

130. Разгледзьце малюнак.



Адкажыце на пытанні:

Што вы бачыце на малюнку?
Хто будуе дом?

Што абазначаюць гэтыя словы?

Словы для даведкі: *сцены, лесвіца, дах, вокны, кран, кранаўшчык, інжынер.*

Словы, якія называюць прадметы, адказваюць на пытанні х т о? ш т о?: *шафёр, машына, урач, цукерка.*

131. Замест кропак устаўце патрэбныя словы. Запішыце дзве групы слоў на выбар.

Мэбля (ш т о?): ..., ..., ...
Людзі (х т о?): ..., ..., ...
Птушкі (х т о?): ..., ..., ...
Посуд (ш т о ?): ..., ..., ...
Гароднiна (ш т о?): ..., ..., ...

С л о в ы д л я д а в е д к і: *вераб'і, шафа, дзяўчынка, будаўнік, ластаўка, цыбуля, талерка, канапа, відэлец, ложак, сусед, грак, лыжка, морква, гарбуз.*

У з о р. *Мэбля* (ш т о?): *шафа, канапа, ложак.*

Успомніце з урокаў рускай мовы!

Да якіх слоў ставіцца пытанне х т о?, а да якіх — ш т о?

132. Прачытайце верш.

Малаток, рубанак, пілку
паппрасіў я ўранні ў таты
і да вечара на славу
змайстраваў шпакоўню-хату.
І. Шуцько

Назавіце ў вершы словы, якія абазначаюць прадметы. На якія пытанні яны адказваюць?

Выпішыце выдзеленыя словы. Назавіце іх адным словам.

ле́свіца

133. Прачытайце і запомніце прыказкі. Пра каго можна так сказаць?

Рукі малыя ды да працы ўдалыя.

Дрэнныя тыя рукі, што не ведаюць ніякай навукі.

Запішыце першую прыказку па памяці.

Падкрэсліце словы, якія абазначаюць прадметы.

134. Замяніце адным словам.

1. Чалавек, які працуе на будоўлі.
2. Вадзіцель аўтамабіля.
3. Рад прыступак для пад’ёму і спуску.
4. Прылада для капання зямлі.

рыдлёўка

будаўнік



лесвіца

шафёр

Запішыце словы. У дужках пастаўце да іх пытанні.

У з о р: (х т о?) *будаўнік*.

135. Выпішыце спачатку словы, якія адказваюць на пытанне х т о? Пасля выпішыце словы, якія адказваюць на пытанне ш т о?

Ручнік, кватэра, матуля, дзядуля, конь, дождж, надвор’е, птушка.

Прыназоўнік

Успомніце!

Як называюцца ў рускай мове словы, якія служаць для сувязі слоў у сказе.

па-руску	**па-беларуску**
предлог	прыназоўнік

136. Разгледзьце малюнкі. Дзе сядзіць грак?

Грак сядзіць ... дрэве.



Грак сядзіць ... дрэвам.

Грак сядзіць ... дрэвам.

Вусна дапоўніце сказы патрэбнымі словамі, каб іх сэнс стаў зразумелым.

Для чаго служыць прыназоўнік у сказе?

Прыназоўнікі ***у, на, над, з, за, з-за, да, ад, па, пад*** служаць для сувязі слоў у сказе. Яны пішуцца асобна ад іншых слоў у сказе: *Унук паехаў да бабулі*.

137. Прачытайце. Адкажыце, чаму так гавораць.

Сакавік з в..дой, красавік з трав..й, май з кветкамі.

У сакавіку куры нап..юцца з лужыны.

Спішыце сказы. Устаўце патрэбныя літары, растлумачце іх правапіс. Падкрэсліце прыназоўнікі.

Рм **138.** Разгледзьце малюнак. Якая пара года намалявана?



Адкажыце на пытанні, выкарыстайце словы для даведкі.

Што паказалася **з-за** воблакаў?
Што зелянее **на** дрэвах?
Што з’явілася **на** зямлі?
Адкуль вяртаюцца птушкі?

Словы для даведкі: *сонейка, маладыя лісточкі, першая траўка, з выраю.*

Адказы запішыце. Назавіце ў сказах прыназоўнікі.

Гаварыце правільна

прыйсці са школы
пайсці ў *(па)* грыбы
пайсці ў *(па)* ягады

139. Прачытайце. Якія яшчэ прыкметы вясны вы ведаеце?

Птушкі прылятаюць у красавіку.
Краскі зацвітаюць у красавіку *(Е. Лось).*

кра́скі — кве́ткі

Назавіце ў сказах прыназоўнікі.

140. Прачытайце, спішыце. Устаўце патрэбныя літары, растлумачце іх правапіс. Назавіце прыназоўнікі.

Засп*(е/я)*ваў жаваранак. З лесу павеяла хала*(д/т)*ком. Узышло на небе сонца.

Словы, якія называюць прыметы прадметаў

141. Падбярыце да слоў-назваў іх прыметы.

Журавіны	круглы, румяны салодкі, сакавіты
Вавёрка	вялікае, глыбокае, празрыстае, блакітнае
Яблык	рыжая, маленькая, жвавая, пушыстая
Возера	буйныя, чырвоныя, кіслыя, карысныя

Ад слоў з левага слупка пастаўце пытанні да слоў з правага слупка.

Словы, якія называюць прыметы прадметаў, адказваюць на пытанні **я к і?** (**я к а я? я к о е? я к і я?**): *белы* (снег), *вясёлая* (усмешка), *лагоднае* (сонейка), *цёплыя* (дні).

142. Прачытайце верш.

Я вясну малюю,
фарбаў не шкадую.
Колерам зялёным —
дрэва і палеткі,
колерам чырвоным —
сонейка і кветкі,
колерам блакітным —
неба, ручаіну.
А якую фарбу
воблачку пакіну?

П. Прануза

Якія колеры пераважаюць вясной? Якога колеру воблачка?

Выпішыце з верша ў алфавітным парадку словы-назвы колераў вясны.

143. Адгадайце загадку.

Дзяўчаткі-весялушкі
памылі ў рэчцы стужкі,
цяпер яны не ў косах,
а сохнуць у нябёсах.

Назавіце колеры вясёлкі.

144. Прачытайце. Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

я́блык

Сцежка (я к а я?) вузкая, а дарога … .
Яблык (я к і?) вялікі, а вішня … .
Морква (я к а я?) салодкая, а цыбуля … .
Дрэва (я к о е?) высокае, а куст … .

С л о в ы д л я д а в е д к і: *шырокая, горкая, нізкі, маленькая*.

Запішыце сказ, у якім прадметы параўноўваюцца па велічыні. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў.

У з о р. *Сцежка вузкая, а дарога шырокая.*

145. Прачытайце сказы. Выберыце з дужак словы, якія дапамагаюць апісаць летняе надвор'е.

Летам

Быў *(цёплы, халодны)* дзень. Стаяла *(сонечнае, пахмурнае)* надвор'е. Дзеці пабеглі на рэчку. Яны купаліся ў *(цёплай, сцюдзёнай)* вадзе.

Запішыце сказы. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў.

146. Па прыметах адгадайце, пра што гаворыцца ў загадцы.

Круглы, як мяч,
сало*(д/т)*кі, як мё*(д/т)*,
зверху зялёны,
унутры чырвоны.



Запішыце загадку. Устаўце патрэбныя літары ў словы, растлумачце іх правапіс.

Па перакладным слоўніку праверце, ці правільна вы назвалі слова-адгадку.

Словы, якія называюць дзеянні прадметаў

147. Да слоў з левага слупка падбярыце па сэнсе словы з правага слупка.

Дзецi (што робяць?) ...	*свішча* *вые* *дзьме*
Вецер (што робіць?) ...	*свеціць* *грэе* *прыгравае*
Сонейка (што робіць?) ...	*бегаюць* *гуляюць* *катаюцца*

Што абазначаюць словы правага слупка?

Словы, якія называюць дзеянні прадметаў, адказваюць на пытанні **што раблю? што робіш? што зраблю? што зробяць?** і інш.: *чытаю, чытаеш, напішу, напішуць*.

148. Скажыце, хто як голас падае.



каркае *мяўкае* *гагоча* *вые*

Запішыце сказы. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць дзеянне прадмета.

У з о р. *Варона каркае.*

149. Прачытайце. Адгадайце загадку. Скажыце, якія словы падказалі вам адгадку.

Хто гэта?

Тра*(у/ў)*ку ірве, жвачку ж*(у/ў)*е, пойла п’е, мы́кае і раве, гаспадыню заве.

Спішыце, устаўце прапушчаныя літары. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць дзеянне прадмета. Вусна пастаўце да іх пытанні.

150. Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

Справы словамі не заменіш.

Назавіце ў прыказцы слова, якое абазначае дзеянне прадмета.

Запішыце прыказку па памяці.

151. Прачытайце сказы ў парадку ўзрастання хуткасці руху.

Чалавек **ідзе**. Чарапаха **паўзе**. Машына **імчыцца**. Конь **бяжыць**.

Назавіце словы, якія абазначаюць дзеянне прадметаў.

152. Прачытайце скорагаворку.

Спрытна кроп
палоў Пракоп.
Лёг пад кропам
і захроп.

В. Вітка

кроп — рус. *укро́п*

Спішыце, падкрэсліце словы, якія абазначаюць дзеянне прадмета. Вусна пастаўце да іх пытанні.

Адкажыце на пытанні

1. На якія пытанні адказваюць словы, што абазначаюць прадметы?

2. На якія пытанні адказваюць словы, што абазначаюць прыметы прадметаў?

3. На якія пытанні адказваюць словы, што абазначаюць дзеянні прадметаў?

4. Для чаго служаць прыназоўнікі? Як яны пішуцца з іншымі словамі?

СКАЗ

153. Знайдзіце сярод прапанаваных спалучэнняў слоў сказ. Па якіх прыметах вы вызначылі, што гэта сказ? Выпішыце сказ.

Таня, спячы, торт, для, свой, матуля.

Таня спякла торт для...

Таня спякла торт для сваёй матулі.

Сказ выражае закончаную думку.

Першае слова ў сказе пішацца з вялікай літары. У канцы сказа ставіцца кропка (.), пытальнік (?) або клічнік (!).

154. Выразна прачытайце верш.

— Што, сябры, для жыта трэба?
— Ну, вядома, трэба глеба.

— А для птушкі?
— Вышыня.
— А для казкі?
— Цішыня.
— Ну, а што для весялосці?
— Каб часцей бывалі госці!

М. Гелер

Знайдзіце і прачытайце сказы-пытанні. Які знак стаіць у канцы?

Знайдзіце і прачытайце сказы-адказы. Які знак стаіць у канцы гэтых сказаў?

Знайдзіце сказ, які трэба чытаць з павышанай інтанацыяй. Які знак стаіць у канцы гэтага сказа?

У якіх сказах больш за ўсё слоў? У якіх сказах менш за ўсё слоў?

155. Прачытайце. Колькі тут сказаў? Спішыце, правільна афармляючы сказы на пісьме.

Летам Паўлік паехаў да цёткі ў вёску там хлопчык знайшоў сабе новых сяброў яны разам лавілі ў рэчцы рыбу

156. Прачытайце. Чаму гэтыя словы нельга назваць сказам?

Расстаўце словы ў патрэбным парадку.

Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся правільна вымаўляць яе. Растлумачце правапіс літар ***у*** і ***ў***.

157. Прачытайце прыказкі. Якая думка выражаецца ў іх?

Адклад не ідзе на лад.

Сон на заўтра адкладзі, а справу сёння зрабі.

Колькі слоў у кожным сказе? Растлумачце правапіс слоў у прыказках.

Запішыце па памяці першую прыказку.

158. Вызначце межы сказаў.

Ранкам у лесе пахнуць кветкі на розныя галасы заліваюцца птушкі

Спішыце. Пастаўце ў канцы сказаў патрэбныя знакі прыпынку.

159. Да слоў з левага слупка падбярыце словы з правага слупка.

ружы ...	спявае
шпакі ...	чытае
хлопчык ...	цвітуць
сонейка ...	спіць
дзіця ...	свеціць
дзяўчынка ...	прыляцелі

Запішыце 3 сказы (на выбар). Пра каго або пра што гаворыцца ў кожным сказе? Падкрэсліце гэтыя словы адной рыскай.

У з о р. *Ружы цвітуць.*

160. Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

… ловіць мышэй.
… растае́ вясной.
… лечыць людзей.

Спішыце сказы. Пра каго або пра што гаворыцца ў кожным сказе? Падкрэсліце гэтыя словы адной рыскай. Што пра іх гаворыцца? Падкрэсліце гэтыя словы дзвюма рыскамі.

Рм **161.** З асобных слоў складзіце сказы.

калідо́р

Коля, клас, спяшаўся, ў.
У, хлопчык, калідоры, настаўніцу, сустрэў.
Коля, з, ёй, павітаўся.

Запішыце сказы. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.
Назавіце ў сказах прыназоўнікі.
Якімі словамі можна вітацца з настаўніцай? З сябрамі?

Гаварыце правільна

Павітацца з настаўніцай, дзякаваць бабулі, дараваць сябру.

162. Размясціце радкі верша па парадку.

1. На травінках павучок
? — Прылятайце, мухі, мошкі,
? выткаў тонкі гамачок.
? і пагушкайцеся трошкі.

У першым сказе назавіце словы, якія абазначаюць, пра каго гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.

163. З асобных слоў складзіце сказы.

Увесну, фіялка, пад, ліпаю, расцвіла.
За, раскінуўся, домам, прыгожы, парк.

Запішыце сказы. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.

Рм **164.** Вусна дапоўніце сказы па пытаннях.

Добра сонечны днём на вуліцы.
Дзяўчынкі катаюцца (н а ч ы м?) на ... .
Хлопчыкі гуляюць (у ш т о?) у ... .
Малыя гушкаюцца (н а ч ы м?) на ... .

У другім сказе назавіце словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.

165. Расстаўце словы ў патрэбным парадку. Запішыце сказы.

Падкрэсліце ў сказах словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца. У другім сказе назавіце прыназоўнік.

166. Прачытайце. Вызначце межы сказаў.

Надыходзяць ц..плыя дз..нькі св..ціць ласкавае сон..йка зазел..нела маладая траўка сп..ваюць галасістыя птушкі.

Спішыце. Назавіце ў сказах словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.

Якія літары трэба ўставіць у словы? Растлумачце правапіс літар ***е, ё — я***.

167. Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

Лета збірае, а зіма праядае.
Лянок не любіць ляноты.

Колькі слоў у сказах? Спішыце сказ з чатырох слоў. Падкрэсліце ў ім словы, якія абазначаюць, пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.

168. З асобных слоў складзіце сказы і запішыце.

Дзеці, у, лес, прыйшлі.
Тут, ландышы, цвітуць.
Прыгожа, птушкі, спяваюць.

Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.

Адкажыце на пытанні

1. Што выражае сказ?
2. З якой літары пішацца першае слова ў сказе?
3. Якія знакі прыпынку ставяцца ў канцы сказа?

ТЭКСТ

Успомніце з урокаў рускай мовы

З чаго складаецца тэкст?

169. Прачытайце дзве групы сказаў.

I. Мы хадзілі ў грыбы. Я сустрэла сяброўку Таню. Бабуля згатавала грыбны суп. Ваверка збірае грыбы і запасае іх на зіму.

II. Сяргейка ўлетку часта хадзіў у грыбы. Шмат грыбоў было ў лесе. Кожны грыб ён акуратна зразаў. Хлопчык вяртаўся дамоў задаволены.

У якой групе сказы звязаны па сэнсе? Якую групу можна назваць тэкстам? Пра каго расказваецца ў тэксце?

Некалькі сказаў, звязаных паміж сабой па сэнсе, называюцца тэкстам.

170. Пастаўце сказы ў патрэбнай паслядоўнасці, каб атрымаўся тэкст.

Там яны бачылі шмат розных звяроў і птушак.

Вася прачнуўся рана.

Яны паехалі ў заапарк.

Ён устаў, паснедаў і пайшоў з татам на аўтобусны прыпынак.

Запішыце тэкст. У першым сказе падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.

171. З асобных слоў вусна складзіце сказы.

Лёня, са, вяртаўся, школы. Раптам, убачыў, ён, кацяня, маленькае. Яно, мяўкала, жаласна. Хлопчык, яго, падняў, і, дамоў, прынёс. Цяпер, жыве, у, кацяня, Лёні.

Ці ўтвараюць сказы тэкст? Чаму?

Назавіце ў сказах прыназоўнікі.

172. Прачытайце тэкст. Якую ён мае назву? Колькі ў ім сказаў?

Мая градка

Я на дачы маю градку,
даглядаю сам яе.
Раскажу вам па парадку,
што на ёй цвіце-расце:
мак, часнок, гарох, салата,
па баках — і кроп, і мята.

Н. Галіноўская

У якіх словах трэба праверыць правапіс парных звонкіх–глухіх зычных? Вусна падбярыце да іх праверачныя словы.

173. Пастаўце сказы ў патрэбнай паслядоўнасці, каб атрымаўся тэкст.

Добра іграў на ёй камарык у арэшніку. Была ў камарыка скрыпачка. Тут і ветрык яму падпяваў, і сябры-камарыкі. Цэлы аркестр атрымаўся.

Спішыце першыя два сказы тэксту.

174. Прачытайце тэкст.

Мядзведзь любіць лавіць рыбу. Ён доўга можа сядзець у вадзе і чакаць. Вось плыве вялікі ласось. Мядзведзь лоўка хапае яго лапай і выкідвае на бераг.

Пра каго расказваецца ў тэксце? Што аўтар хацеў сказаць пра мядзведзя?

З прапанаваных загалоўкаў выберыце той, які найбольш падыходзіць да гэтага тэксту: «Мядзведзь», «Добры рыбак», «Рыбалка».

Сказы ў тэксце аб'ядноўваюцца тэмай і галоўнай думкай.

Тэма — гэта тое, пра што гаворыцца ў тэксце.

Галоўная думка — гэта асноўнае, пра што аўтар хоча сказаць чытачу.

На тэму або галоўную думку можа ўказваць загаловак тэксту.

175. Прачытайце загаловак тэксту. Як вы думаеце, на якую тэму (пра што) гэты тэкст?

Падзяліце тэкст на сказы. Ці падказаў вам загаловак тэму тэксту?

Дружок

На лесвіцы скуголіла шчаня я ўзяў яго і прынёс дамоў шчаня хутка прывыкла да мяне я назваў яго Дружок пазней Дружок стаў маім верным сябрам

Запішыце тэкст, правільна афармляючы сказы на пісьме.

176. Прачытайце. Якая прыказка падыходзіць да тэксту з практыкавання 175?

Чалавек без сяброў — што дрэва без каранёў.

Пры́яцеля пазнаеш у няшчасці.

Лепш адзін прыяцель, чым дзесяць ворагаў.

177. Прачытайце тэкст.

Сапраўдны сябар

Быў у Мішы сабачка Шарык. Міша і Шарык заўсёды гулялі разам. Аднойчы хлопчык з сабакам пайшоў на рэчку. Міша падышоў блізка да вады. Раптам ён паслізнуўся і ўпаў у раку. Шарык кінуўся ў ваду. Ён схапіў Мішу за кашулю і пацягнуў да берага. Так Шарык выратаваў свайго сябра.

Пра што гэты тэкст? На тэму ці на галоўную думку тэксту ўказвае загаловак? Якая прыказка з практыкавання 176 дапамагае раскрыць галоўную думку тэксту?

178. Пастаўце сказы ў патрэбнай паслядоўнасці, каб атрымаўся тэкст.

Школьнікі часта прыходзяць да яго. У нашай вёсцы жыве старэнькі дзядуля. Дзядуля вельмі ўдзячны маленькім памочнікам. Дзеці падмятаюць падлогу, носяць ваду.

Які загаловак найбольш падыходзіць да тэксту: «Дзядуля», «Маленькія памочнікі»?

Запішыце першыя два сказы тэксту.

179. Прачытайце тэкст.

Напалі на сасну чарвякі і вусені. Захварэла сасна. Пачалі жоўкнуць і асыпацца шыпулькі.

Прыляцеў да дрэва стракаты дзяцел. Потым з'явілася маленькая птушка каралёк. Яна заняла верхнія тонкія галінкі. Ніжэй прымасціліся сінічкі з чорнымі галоўкамі. Яшчэ ніжэй прыселі сініцы ў беленькіх шапачках. Калупаў дзюбай у

кары попаўзень. Усім птушкам хапіла работы.

Выратавалі дрэва санітары лесу. Сасна была ўдзячная птушкам.

шыпу́лькі — рус. *иго́лки* (у хвойных растений)
страка́ты — рус. *пёстрый*

Пра што гэты тэкст? Які загаловак найбольш падыходзіць да тэксту: «Хворая сасна», «Санітары лесу», «Дапамога сасне»?

На што ўказвае загаловак: на тэму ці на галоўную думку тэксту?

180. Выберыце з тэксту практыкавання 179 сказы, якімі можна падпісаць кожны малюнак.

Рм **181.** Адкажыце на пытанні да тэксту. Выкарыстайце прапанаваныя словы.

1. Што здарылася з сасной?
2. Хто прыляцеў да сасны?
3. Што зрабілі санітары лесу?

Словы для даведкі:

1) *чарвякі і вусені, захварэла, пажоўклі шыпулькі*;

2) *стракаты дзяцел, каралёк, сінічкі з чорнымі галоўкамі, сінічкі ў белых шапачках, попаўзень*;

3) *выратавалі дрэва*.

182. Прачытайце прыказкі. Якая з іх падыходзіць да тэксту з практыкавання 179.

Ластаўка дзень пачынае, а салавей канчае.

Птушка малая, а карысць ад яе вялікая.

кары́сць — рус. *по́льза*

Запішыце прыказку пад дыктоўку настаўніка.

Рм **183.** Вусна перакажыце тэкст практыкавання 179 па пытаннях.

184. Расстаўце словы ў патрэбным парадку, каб атрымаліся сказы.

Запішыце сказы. Правільна аформіце іх на пісьме.

Адкажыце на пытанні

1. З чаго складаецца тэкст?
2. На што можа ўказваць загаловак тэксту?

ПАЎТАРЭННЕ

185. Прачытайце. Які загаловак можна даць вершу?

На сняданак і ў абе*(д/т)*
на стале заўсёды хле*(п/б)*.
Хле*(п/б)* — святыня,
хле*(п/б)* — бага*(ц/цц)*е.
Хле*(п/б)* у хаце —
шчасце ў хаце.

Л. Пранчак

Прачытайце сказ, у якім заключаецца галоўная думка верша. Спішыце яго. Якія літары трэба ўставіць у словы? Растлумачце іх правапіс.

186. Прачытайце. Чаму так гавораць?

Хлеб усяму галава.
Калі хочаш хлеб мець, то трэба зямліцу глядзець.

Якая прыказка падыходзіць да верша з практыкавання 185 і дапамагае раскрыць яго галоўную думку? Запішыце па памяці гэтую прыказку.

187. Разгадайце рэбус.

Х  ’ Б

Дапоўніце і запішыце сказ:

... — гэта праца многіх людзей.

Падкрэсліце літары, якія абазначаюць мяккія зычныя гукі.

Назавіце слова, у якім ёсць няпарныя цвёрдыя зычныя гукі.

188. Прачытайце назвы прафесій людзей. Паспрабуйце растлумачыць, што робяць людзі кожнай з гэтых прафесій.

Палявод, камба́йнер, трактарыст, пекар, **мельнік**, прадавец.

Спішыце словы ў алфавітным парадку. Выдзеленае слова падзяліце на склады. Колькі гукаў і колькі літар у гэтым слове?

189. Прачытайце верш. Растлумачце правапіс прапушчаных літар.

Пшанічны к..лас — важкі самы,
ён дасп..вае ў жніўны час.
Пшанічны кол..с — шчодры самы,
частуе белым хлебам нас.

М. Чарняўскі

Спішыце першы сказ, устаўляючы прапушчаныя літары.

190. Прачытайце верш.

Чорны, белы хлеб ці здобу
еш, але не забывай
быць удзячным хлебаробу,
што вырошчваў ураджай.

А. Вольскі

Назавіце словы, у якіх ёсць няпарныя цвёрдыя зычныя гукі.

Знайдзіце і прачытайце словы, якія абазначаюць прадметы.

191. Прачытайце верш.

Павучок

Пав*(у/ў)*чок — ткач-ткачок,
се*(у/ў)* на тоненькі сучок.
Павуці*(н/нн)*е сваё тка*(у/ў)*
і на го*(л/лл)*ейку снаваў.

Л. Геніюш

го́ллейка — *галі́нкі*

Якія літары трэба ўставіць у словы? Растлумачце іх правапіс. Запішыце гэтыя словы.

Выдзеленае слова падзяліце для пераносу. Падкрэсліце ў ім літары, якія абазначаюць няпарныя звонкія зычныя гукі.

192. Прачытайце верш. Назавіце словы ў вершы, якія адрозніваюцца адным гукам.

Х.́.раша, х.́.раша
летам у б..ры —
і грыбы, і ягады
ў пры́гаршчы бяры.

А. Вольскі

Спішыце. Устаўце ***о, э*** або ***а***, растлумачце іх правапіс.

193. Расстаўце словы ў патрэбным парадку, каб атрымаліся сказы.

Запішыце сказы. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.

194. Прачытайце скорагаворку. Вызначце націскныя склады ў словах. Навучыцеся правільна вымаўляць скорагаворку.

Жнівень працаваць умее —
жнівень жне і жнівень сее.
Н. Галіноўская

Назавіце ў скорагаворцы словы, якія абазначаюць дзеянне прадметаў.

195. Прачытайце верш, правільна вымаўляючы гукі **[т]**, **[ц’]**.

Ве..ер шэпча з каласамі.
Жмура..ь вочы васількі.
Жыта колецца вусамі —
ас..ярожна, матылькі!

Н. Галіноўская

Растлумачце, якія *вочы ў васількоў* і *вусы ў жыта*.

Якія літары трэба ўставіць у словы? Растлумачце іх правапіс.

196. Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць яе.

У чэрвені чарнеюць чарніцы
і чырванеюць суніцы.

С. Шушкевіч

Спачатку назавіце словы з мяккім гукам **[ц’]**, а потым — з няпарным цвёрдым гукам **[ц]**.

Назавіце словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў.

197. Прачытайце верш. Вусна перакладзіце слова *сподак* на рускую мову.

Лясныя сподачкі

Выраслі ля сце*(ж/ш)*кі
спо*(д/т)*кі-сырае*(ж/ш)*кі,
сподачкі ўсе новыя,
рознакаляровыя.

Смоўж з іх п*(ь/')*е,
сойка п*(ь/')*е.
Пойдзе дож*(дж/ч)* —
іх зноў **нал*(ь/')*е.**
В. Пчолка

Якія літары або знакі трэба ўставіць у словы? Чаму? Спішыце другі слупок верша. Падзяліце выдзеленыя словы для пераносу.

198. Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць яе.

Назавіце ў сказе прыназоўнікі. Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

Б**я**ры з сабою нож**ы**к,
гр**ы**бы збірай у кош**ы**к.
Н. Мікліс

199. Прачытайце заклічку. Назавіце словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў.

Дожджык, дожджык дробненькі,
будзь ты, дожджык, добранькі,
лíся ты ўсю ночку,
каб раслі грыбочкі.

А. Дзеружынскі

Растлумачце правапіс літар ***д, дз***.

200. Прачытайце верш. Якія літары трэба ўставіць у словы? Растлумачце іх правапіс.

Но*(ч/чч)*у *(т/ц)*ёплы дождж прайшоў,
і, як *(дз/д)*еткі каля маткі,
ля стар*(е/э)*нькіх масляко*(у/ў)*
в*(е/я)*сяля́цца масл*(е/я)*няткі.

В. Гардзей

Спішыце, устаўце патрэбныя літары.

Падкрэсліце літары, якія абазначаюць мяккасць папярэдняга зычнага гука.

201. Гульня «Ланцужкі назваў». Складзіце ланцужкі слоў. Кожнае наступнае слова павінна пачынацца з апошняй літары папярэдняга.

У з о р:

назва грыба

баравік імя дзяўчынкі

Кацярына школьная прылада

аловак назва горада

Клецк

Растлумачце правапіс вялікай літары ў словах.

Слоўнікавыя словы

адка́з
вераб'і
від́элец
во́кладка
гарбу́з
дзве́ры
дзяўчы́нка
дождж
ёсць
калідо́р
кватэ́ра
ла́стаўка
ле́свіца
ме́сца
надво́р'е
рукза́к
ручні́к
сусе́д
сцю́жа
тале́рка
учо́ра
цыбу́ля
я́блык

Змест

Свірыдзенка, В. І.

С24 Беларуская мова : вучэб. дапам. для 2-га кл. агульнаадукац. устаноў з рус. мовай навучання. У 2 ч. Ч. 2 / В. І. Свірыдзенка. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2010. — 120 с. : іл.

ISBN 978-985-465-772-1.

УДК 811.161.3(075.2=161.1)
ББК 81.2Рус-922

Вучэбнае выданне

Свірыдзенка Вольга Іванаўна

БЕЛАРУСКАЯ МОВА

Вучэбны дапаможнік для 2 класа
агульнаадукацыйных устаноў
з рускай мовай навучання

У дзвюх частках
Частка 2

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *Г. І. Бандарэнка*
Рэдактар *Л. Ф. Леўкіна*
Мастак *М. У. Мароз*
Мастацкі рэдактар *І. А. Усенка*
Камп’ютарная вёрстка *Ю. М. Галавейкі*
Карэктары *К. І. Іванова, Т. Ф. Шайко*

(Назва і нумар школы)

Навучальны год	Імя і прозвішча вучня	Стан падручніка пры атрыманні	Адзнака вучню за карыстанне падручнікам
20 /			
20 /			
20 /			
20 /			
20 /			

Падпісана ў друк 14.10.2010. Фармат 70×90/16.
Папера афсетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 8,78.
Ул.-выд. арк. 2,83 + 0,4 форз. Тыраж 97 400 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. ЛИ № 02330/0494469 ад 08.04.2009. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

ААТ «Паліграфкамбінат імя Якуба Коласа».
ЛП № 02330/0150496 ад 11.03.2009. Вул. Чырвоная, 23, 220600, г. Мінск